■ K@нтыненты

ШЛЯХ НА ПОЎНАЧ

Навошта Македонія змяняе назву?

Міністры замежных спраў Грэцыі Нікас Кадзіяс і Былой Югаслаўскай Рэспублікі Македонія (БЮРМ) Нікола Дзімітраў падпісалі пагадненне аб новай канстытуцыйнай назве Македоніі. Подпіс пад пагадненнем паставіў таксама спецпрадстаўнік генеральнага сакратара ААН Мэцью Німіца, які выступіў пасярэднікам на перагаворах. Падпісанне прысутныя сустрэлі апладысментамі і крыкамі «брава!». Цырымонія падпісання адбылася ў пасёлку Псарадзес каля возера Прэспа, што на мяжы дзвюх краін, у прысутнасці прэм'ер-міністраў Алексіса Цыпраса і Зорана Заева. Тут таксама прысутнічалі намеснік генеральнага сакратара ААН Размары Дзікарла, высокапастаўленыя еўрапейскія чыноўнікі — кіраўнік еўрапейскай дыпламатыі Федэрыка Магерыні і еўракамісар Ёханес Хан. Да вялікай палаткі, устаноўленай на ўзбярэжжы, дэлегацыі дабіраліся на катарах. Урачыстую цырымонію транслявала ў прамым эфіры грэчаскае грамадскае тэлебачанне ERT. Падпісаны дагавор называюць гістарычным. Навошта перайменавалі Македонію?

Праект Ціта

У часы ранняй антычнасці Македонія, населеная пераважна грэчаскімі плямёнамі, цалкам увайшла ў склад дзяржавы Аляксандра Македонскага. Пасля гэтую тэрыторыю заваявала Рымская імперыя, у выніку чаго пачаўся працэс раманізацыі мясцовага насельніцтва. Пазней рэгіён стала кантраляваць Візантыя, у Сярэднявеччы тут актыўна сяліліся паўднёвыя славяне. Пасля далучэння да Асманскай імперыі ўзмацніўся працэс балканізацыі рэгіёна. Пасля дзвюх балканскіх войнаў населеная многімі нацыянальнасцямі гісторыка-геаграфічная вобласць Македоніі была падзелена паміж Грэцыяй (Эгейская Македонія), Сербіяй (цяперашняя Македонія — Вардарская Македонія) і Балгарыяй (Пірынская Македонія).

Пасля Другой сусветнай вайны ў Федэратыўнай Народнай Рэспубліцы Югаславія, якая складалася з шасці сацыялістычных рэспублік, з'явілася Сацыялістычная Рэспубліка Македонія. Камуністычны лідар абвясціў аб стварэнні Сацыялістычнай Рэспублікі Македонія ў складзе Югаславіі. Для гэтага, як лічыцца, было дзве прычыны — павысіць статус мясцовага насельніцтва, каб разарваць сувязь з Балгарыяй, і падрыхтаваць плацдарм для экспансіі ў Грэцыю, у якой ішла грамадзянская вайна.

Як адзначае шэраг экспертаў, сучасная дзяржаўнасць Македоніі — шмат у чым тварэнне югаслаўскага лідара Іосіпа Броз Ціта. Македонія ў складзе Югаславіі ўяўляла сабой 35,8 працэнта тэрыторыі гістарычнай Македоніі. Яшчэ амаль 10 працэнтаў — гэта сёння тэрыторыя Балгарыі, а больш за 50 працэнтаў — вобласць сучаснай Грэцыі. Ціта ў канцы 1940-х гадоў працаваў над стварэннем Федэрацыі балканскіх дзяржаў, у рамках якой уся гістарычная Македонія павінна была стаць адзіным цэлым.

Праект не быў рэалізаваны, але суседзі, асабліва грэкі, пра гэтыя намаганні не забылі. І калі трываць Македонію ў якасці саюзнай рэспублікі ў складзе Югаславіі Афіны яшчэ былі гатовыя, то абвяшчэнне незалежнасці выклікала ў грэкаў адкрытае супраціўленне. Калі дакладней, то ўлады Грэцыі катэгарычна не задавальняла абвешчаная новай дзяржавай назва — «Рэспубліка Македонія». У Афінах разглядаюць яе як падставу для прад'яўлення тэрытарыяльнай прэтэнзіі на грэчаскую Македонію.

Нашчадкі Македонскага

Пасля распаду былой Югаславіі, у якой яна займала самую паўднёвую частку, утварылася дзяржава з насельніцтвам крыху больш чым два мільёны чалавек. Грэцыя ўстала на шляху новай суседкі. Без згоды грэкаў Македонію не маглі прыняць ні ў адну міжнародную арганізацыю. Спрэчка вакол уступлення ў ААН расцягнулася амаль на тры гады і ў выніку скончылася тым, што новую дзяржаву прынялі пад больш чым дзіўнай назвай «Былая Югаслаўская Рэспубліка Македонія». У самой Грэцыі краіну-суседку шмат гадоў называюць «Рэспубліка Скоп'е», ці проста «Скоп'е», адштурхоўваючыся ад назвы сталіцы.

У 2008 годзе, калі на саміце НАТА ў Бухарэсце Грэцыя заблакавала запрашэнне Македоніі, краіны — члены блока дамовіліся вярнуцца да пытання ўступлення толькі пасля вырашэння спрэчкі паміж дзвюма дзяржавамі. А міністр замежных спраў Македоніі Антоніа Міласоскі тады заявіў: «Мы — македонцы, а наша краіна — Рэспубліка Македонія, і яна застанецца такой назаўжды».

Аналагічная гісторыя здарылася і з перагаворамі аб уступленні Македоніі ў Еўрасаюз. Эканамічнае становішча самой Грэцыі не ідэальнае, і прадстаўнікі міжнародных структур не раз намякалі Афінам на тое, што трэба быць больш падатлівымі. Пад ціскам эмісараў ЕС і НАТА грэкі пагадзіліся пайсці на некаторыя саступкі, але ад галоўнага не адмовіліся — назву «Рэспубліка Македонія» неабходна скарэктаваць.

Цяпер самай папулярнай партыяй краіны застаецца «Унутраная македонская рэвалюцыйная арганізацыя — Дэмакратычная партыя за македонскае нацыянальнае адзінства» (УМРА-ДПМНА)». Менавіта ў яе ўваходзіць прэзідэнт Георге Іваноў. Пазіцыя партыі — ніякіх саступак у назве краіны, паколькі яны падрываюць яе дзяржаўнасць.

«Рэвалюцыянеры» мяркуюць, што пад брэндам «дзяржавы Аляксандра Македонскага» працэй аб'ядноўваць прадстаўнікоў розных народаў і змагацца з сепаратызмам.

Македонія не па чутках ведае, што такое сепаратызм. Эканамічная бязладзіца ў гэтай рэспубліцы прывяла да росту міжэтнічнай напружанасці. Каля 25 працэнтаў насельніцтва Македоніі — албанцы. Албанская абшчына з кожным годам усё гучней патрабуе незалежнасці, адмаўляючыся падпарадкоўвацца цэнтральнаму ўраду і абвінавачваючы Скоп'е ў славянскім нацыяналізме. У пачатку 2000-х у краіне ледзь не быў рэалізаваны «косаўскі сцэнарый». Узброеныя албанскія радыкалы пачалі баявыя дзеянні супраць урадавых сіл, і ў нейкі момант падавалася, што распаду краіны пазбегнуць не ўдасца.

Дзень Ільі

Аднак у канцы мінулага года Скоп'е і Афіны раптам надумалі вырашыць праблему. Да таго ж чым хутчэй — тым

лепш. Па выніках снежаньскай сустрэчы прадстаўнікоў дзвюх краін у Бруселі спецпасланнік генеральнага сакратара ААН Мэцью Німіц заявіў, што вырашыць застарэлую спрэчку можна менш чым за паўгода. Прэм'ер-міністр Македоніі Зоран Заеў паабяцаў правесці рэферэндум, на якім будзе прынятая новая назва краіны. Македонскія СМІ тады прыводзілі мноства магчымых варыянтаў: Рэспубліка Новая Македонія, Рэспубліка Паўночная Македонія, Рэспубліка Верхняя Македонія і Вардарская Рэспубліка Македонія.

А сёлета ў канцы мая македонскі ўрад заявіў: Скоп'е і Афіны ўшчыльную падышлі да вырашэння спрэчкі. Рэспубліка Іліндэнская Македонія — «назва з часавым вызначальнікам, якая спасылаецца на канкрэтныя даты з мінулага і задавальняе македонскі і грэчаскі бакі», гаварылася ў паведамленні Кабміна. Па словах Заева, рэспубліка спадзявалася вырашыць спрэчку з Грэцыяй да чэрвеньскага саміту ЕС. «Для Македоніі членства ў еўрапейскай сям'і азначае эканамічны рост, спалучанасць і роўныя магчымасці для маладых людзей у Македоніі і іх адначасовы ўдзел у ЕС», — сказаў прэм'ер-міністр краіны — кандыдата на ўступленне ў Еўрапейскі саюз.

Але адкуль пайшла назва? Справа ў тым, што адно з самых галоўных дзяржаўных свят Македоніі — Дзень Рэспублікі, або Іліндэн («Дзень Ільі»), — адзначаецца 2 жніўня. У гэты дзень македонцы згадваюць дзве гістарычныя падзеі. Па-першае, пачатак Іліндэнскага паўстання. Яно пачалося ў горадзе Крушава ў ноч на 2 жніўня 1903 года — больш за 800 вайскоўцаў вызвалілі горад ад турэцкага прыгнёту, а Нікола Караў абвясціў незалежнасць Крушаўскай Рэспублікі і стаў яе старшынёй. Праз дзесяць дзён незалежнасці 18-тысячнае войска Асманскай Імперыі зноў заняло горад, а да верасня ўсё паўстанне было жорстка задушана. Таксама Іліндэн атаясамляецца з правядзеннем у 1944 годзе антыфашысцкага сходу па народным вызваленні Македоніі.

Хто на кані?

Аднак ужо ў чэрвені стала вядома, што Афіны і Скоп'е выключылі ўсе ранейшыя варыянты і спыніліся на новай назве — Рэспубліка Паўночная Македонія. І падзеі пачалі раскручвацца вельмі хутка. Парламент Македоніі за некалькі дзён адобрыў і ратыфікаваў дагавор аб змене назвы дзяржавы. Са свайго боку Георге Іваноў заявіў, што рашэнне заключыць з Грэцыяй дагавор аб назве краіны з'яўляецца асабістым рашэннем прэм'ера Зорана Заева і міністра замежных спраў Ніколы Дзімітрава. Таму ён лічыць дагавор недасканалым, што ён парушае Канстытуцыю.

Прэм'ер-міністр дэмарш прэзідэнта без увагі не пакінуў, заявіўшы, што Іваноў становіцца на шляху «еўрапейскіх перспектыў» Македоніі. Урад гатовы ісці на саступкі не толькі ў назве краіны, але і ў перайменаванні практычна ўсіх аб'ектаў, якія маюць умоўную прывязку да антычнай гісторыі. Самы яскравы прыклад у гэтым плане — перайменаванне статуі Аляксандра Македонскага, якая стаіць у цэнтры Скоп'я, у абстрактнага «Чалавека на кані». Відавочна, што ў Македоніі — маштабны палітычны крызіс. Прэзідэнт і прэм'ер-міністр вінавацяць адзін аднаго ў здрадзе нацыянальным інтарэсам краіны, ні адзін з бакоў канфлікту не жадае ісці на кампраміс, апелюючы да народа. Падобны сцэнарый добра вядомы: ён увесь час разыгрываецца то ў адной, то ў другой краіне свету.

Хто ж разыграе «македонскую карту»? Адназначнага адказу эксперты не даюць, аднак агучваюць варыянты. Перайменаванне Македоніі неабходнае перш за ўсё НАТА, таму што ўступіць у альянс можа толькі краіна, у якой няма ніякіх ворагаў, тэрытарыяльных прэтэнзій або канфліктаў. А ў дадзеным выпадку была істотная праблема ў адносінах з Грэцыяй. Такім чынам, перайменаванне — гэта выкананне патрабаванняў Паўночнаатлантычнага блока, растлумачыў РІА «Навіны» генеральны дырэктар Інстытута рэгіянальных праблем Дзмітрый Жураўлёў. «Грэчаская апазіцыя лічыць, што ўступленне Македоніі ў НАТА ўзмоцніць супярэчнасці паміж краінамі. Але, думаю, такая пазіцыя звязана не столькі з Македоніяй, колькі з імкненнем атакаваць палітычных праціўнікаў. Увогуле кажучы, міравое пагадненне ў сітуацыі шматвяковага «разводу» Грэцыі, Македоніі і Югаславіі малаімавернае, гэтая частка Балкан вылучаецца пастаяннымі канфліктамі», — лічыць вучоны.

У супярэчнасцяў паміж дзвюма краінамі даўняя гісторыя, і яны нашмат глыбейшыя і складанейшыя, чым проста назвы, якія супадаюць, заўважыў РІА «Навіны» прэзідэнт Цэнтра стратэгічных камунікацый Дзмітрый Абзалаў. «НАТА, чые апетыты ў апошні час прыкметна зрушыліся на ўсход Еўропы, вельмі зацікаўлена ў краінах былой Югаславіі. Іх уступленне ў альянс Брусель праціскае вельмі жорстка і паспешліва, не звяртаючы ніякай увагі на настрой і меркаванне насельніцтва», — кажа Дзмітрый Абзалаў.

Тое ж датычыцца і суседніх краін. «Большасць грамадзян Чарнагорыі не ў захапленні ад такога зыходу, у Македоніі зноў пачынаецца разлад, незразумела, чым усё павернецца ў Сербіі, у Босніі і Герцагавіне можа зноў успыхнуць пажар», — лічыць колішні дзяржсакратар па справах Косава і Метохіі Душан Прарокавіч.

Кропку ў гэтым пытанні павінны паставіць самі македонцы на рэферэндуме, які мяркуецца правесці ўвосень. Між тым, як стала вядома, Бі-бі-сі ўжо апублікавала карту, дзе нанесена Паўночная Македонія. Не зарана?

Захар БУРАК

■ Фан-парад

СУСВЕТНАЯ ВЕЧАРЫНКА!

Прайшло амаль паўтара тыдня з пачатку чэмпіянату свету па футболе ў Расіі, і вось ужо атмасфера, якая акружае турнір, распаліла нават самыя чэрствыя і чапурыстыя сэрцы. Свае ўражанні і захапленні ў адрас Расіі выказваюць госці чэмпіянату з усіх канцоў свету, іх сабраў championat.com.

Дзве любові

Карэспандэнт сінгапурскага выдання Дэвід Лі расказаў, што яго падарожжа ў Расію пачалося з наведвання знакамітай Краснай плошчы, дзе ён у першыя гадзіны сустрэў столькі дзіўных людзей, колькі наўрад ці сустрэў за ўсё жыццё. Адным з такіх унікумаў стаў аргенцінскі балельшчык Маці Амая. «Яму 33 гады, але выглядае ён гадоў на 10 старэйшым з яго густой барадой. Ён падарожнічае апошнія шэсць чэмпіянатаў і наведаў 37 краін, пакуль не даехаў да Расіі. І ўсё гэта на веласіпедзе! У яго дзве любові — футбол і веласіпеды. Ён пайшоў з дому 5 красавіка 2012 года і вырашыў згубіцца ў гэтым свеце».

Футбол злучае свет

Выданне Business Insider дзівіцца маштабамі, якія нясе ў сабе чэмпіянат свету па футболе, адзначаючы, што мундзіяль выконвае ролю міратворца, аб'ядноўваючы нацыі. «Кожныя чатыры гады свет злучаецца ў адно цэлае дзеля фестывалю футбола, які прымушае нас на нейкі час забыць пра ўсе праблемы на свеце. Хоць бы на працягу некалькіх тыдняў мы разумеем, што ўсе мы — проста людзі. Чэмпіянат свету ў Расіі — самае лепшае таму пацвярджэнне. Мы бачым гэта ў пабах, на вуліцах, на матчах і на фестывалях балельшчыкаў. Гэта глабальная вечарынка!»

Рускія бегаюць

The Times канцэнтруецца непасрэдна на гульні: «Рускія бегаюць больш і хутчэй». Аўтар дастае статыстычныя выкладкі і рэзюмуе: «Гульцы зборнай Расіі прабягаюць больш за ўсіх на гэтым чэмпіянаце свету — і іх часцей за ўсіх тэсціравалі на допінг, чым каго-небудзь яшчэ на турніры. Таксама яны развіваюць найбольш высокія хуткасці». Выданне паважліва заключае, што дзве перамогі, восем забітых мячоў і ўсяго адзін прапушчаны — гэта самы лепшы старт для краіны — гаспадыні чэмпіянату свету.

Бразільская дружба

Наступную дзіўную гісторыю расказала канадскае выданне Vancouver Courier. «Бразілец Радольфа Мота планаваў паездку ў Расію чатыры гады. Ён і трое яго сяброў наведалі мундзіяль у Бразіліі і дамовіліся паўтарыць гэтую справу праз чатыры гады. Лёс раскідаў хлопцаў па розных краінах. Радольфа жыве ў Ванкуверы, другі сябар у Санкт-Пецярбургу, трэці ў Партугаліі, а чацвёрты застаўся ў Бразіліі. Ва ўсіх свае справы, праца і вучоба. Але яны прыехалі ў Расію ўсе разам, таму што абяцалі адзін аднаму».

Шведы выпілі ўсё піва

Шведам удалося пачаць чэмпіянат свету з перамогі. Для сямі тысяч скандынаваў, якія прыехалі ў Ніжні Ноўгарад на матч, гэта было выдатнай падставай для святкаванняў. Шведскае выданне The Local растлумачыла адзін цікавы нюанс. «Шведскія балельшчыкі проста выпілі ўсё піва ў Ніжнім Ноўгарадзе. Але фішка ў тым, што яны выпілі ўсё піва яшчэ да пачатку гульні. У горадзе ніколі не праводзілі мерапрыемстваў падобнага маштабу, так што шведскія фанаты заспелі мясцовыя пабы знянацку».

Давайце тусавацца!

Reuters расказаў, як чарговы раз былі разбураны стэрэатыпы пра змрочную і недружалюбную Расію, дзе вельмі небяспечна хадзіць па вуліцах. «Давайце тусавацца!» — такімі словамі сустракаюць замежных гасцей мясцовыя жыхары. Не ўсе гарады, якія прымаюць матчы чэмпіянату свету ў Расіі, распешчаны ўвагай турыстаў. Але гэта не перашкаджае ім ствараць неверагодную атмасферу свята. «Мая жонка была супраць паездкі ў Расію, ды і на рабоце мне казалі, што гэта не самая лепшая ідэя. Але ўсё было вельмі і вельмі крута», — прызнаўся балельшчык з Шатландыі, які прыехаў на турнір з 10-гадовым сынам.

ХОЦЬ КАРДОНКАЙ, АЛЕ ПАЕДУ!

Жонка не пусціла мексіканца на чэмпіянат свету, але сябры ўзялі з сабой яго кардонную копію

З Хаўерам з Мексікі здарылася пацешная, але не самая прыемная гісторыя. Ён не даехаў у Расію на галоўны сусветны турнір, бо... не пусціла жонка. Так што пакуль яго сябры на ўсю моц весяляцца ў Расіі, п'юць тэкілу на Манежнай плошчы і разносяць Нікольскую, ён сядзіць дома і глядзіць матчы па тэлевізары.

На чэмпіянаце свету ў 2014 годзе ў Бразіліі Хаўер і яго сябры так добра правялі час, што вырашылі: у Расію паедуць гэтай жа кампаніяй. У той жа год яны пачалі збіраць грошы на білеты і аўтобус, які змог бы задаволіць усе іх патрэбы. Яны збіраліся размаляваць яго ў нацыянальныя колеры і скарыць на ім Еўропу. Усё ішло добра, пакуль Хаўеру не прыйшлося абвясціць сябрам, што ён нікуды не едзе.

Але яго сябры ад паездкі адмаўляцца не збіраліся. Больш за тое, яны ўзялі з сабой і Хаўера. Ну, не тое каб зусім яго — а кардонную копію. Яны фатаграфуюць яго ўсюды, дзе бываюць: у фан-зоне, на матчы, на вуліцах Масквы і нават у бары сярод дзяўчат. На двайніку Хаўера красуецца футболка, якая не можа не выклікаць усмешку: «Мая жонка не пусціла мяне на чэмпіянат свету».

Сябры нават стварылі суполку ў сацсетках, у якой выкладваюць усе фатаграфіі і відэа, а таксама дзеляцца расказамі пра сваё незабыўнае падарожжа па Расіі. А аўтобус з сабой мужчыны ўсё ж узялі. У пачатку красавіка яны размалявалі транспарт, сабралі неабходныя рэчы і рушылі ў дарогу, а 26 мая ўжо прыплылі ў Германію. «Мы хочам зладзіць найлепшую вечарыну!» — абвяшчае адзін са шматлікіх запісаў у іх суполцы ў «Фэйсбуку». У Маскву мексіканцы прыехалі 13 чэрвеня. З таго часу яны ўжо шмат дзе пабывалі, але, варта аддаць ім належнае, ніколі не забывалі пра свайго сябра.

Вось, напрыклад, Хаўер на фестывалі заўзятараў (фота ўверсе). На Нікольскай Хаўер таксама пабываў (фота злева). І нават з рускімі дзяўчатамі паабдымаўся (фота справа).

Бедны Хаўер, як ён там, на канапе?

Не ўсё радасна

Паўабаронца зборнай Калумбіі Карлас Санчэс атрымаў сотні смяротных пагроз у сацыяльных сетках ад балельшчыкаў нацыянальнай каманды пасля матча з камандай Японіі (1:2). Калумбійскія паліцэйскія пачалі расследаванне па факце пагроз на адрас футбаліста, паведамляе The Guardian. Выданне адзначае, што адзін з карыстальнікаў апублікаваў у «Твітэры» фатаграфію Санчэса побач са здымкам былога гульца зборнай Калумбіі Андрэса Эскабара, якога застрэлілі з-за аўтагола ў матчы чэмпіянату свету ў 1994 годзе, са словамі: «Я прапаную памарыць». Іншы карыстальнік напісаў у адказ наступнае: «Калі Эскабара забілі з-за аўтагола, то і Санчэса павінны забіць». Санчэс атрымаў чырвоную картку за гульню рукой у штрафной плошчы ўжо на трэцяй хвіліне матча з Японіяй. За гэта парушэнне правілаў арбітр прызначыў пенальці, у выніку Калумбія прайграла.

Логойский сельский исполнительный комитет проводит 24 июля 2018 года открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Инженерная инфраструктура	Начальная цена, руб.	Расходы по подготовке землеустроительной документации, руб.	Задаток (рублей)
1	д. Замосточье, ул. Центральная, 2Б, 623284602301000030	0,1276	электроснабжение	2 000.00	1529,53 + реклама	200.00
2	д. Знаменка, У-2, 623284603001000207	0,1063	газо- и водоснабжение	5 000.00	1656,99 + реклама	500.00
3	д. Понизовье, ул. Руднянская, 1, 623284604601000148	0,1400		3 000.00	1424,40 + реклама	300.00
4	д. Понизовье, ул. Руднянская, 3, 623284604601000149	0,1400		3 000.00	1413,95 + реклама	300.00

Земельный участок в д. Понизовье, ул. Руднянская, 1 имеет ограничения в использовании площадью 0,0112 га в связи с расположением в охранных зонах линии электропередачи, площадью 0,1400 га в связи с расположением в охранной зоне реки Гайна; в д. Понизовье, ул. Руднянская, 3 имеет ограничения в использовании площадью 0,0112 га в связи с расположением в охранных зонах линии электропередачи, площадью 0,1400 га в связи с расположением в охранной зоне реки Гайна.

Задаток в размере 10 % от начальной цены земельного участка перечисляется на № BY25AKBB36006191011030000000, БИК AKBB BY 2X, г. Минск, ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 600537220, код 04901. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения.

Аукцион состоится 24 июля 2018 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, 6. **Последний день приема заявлений 18 июля 2018 года до 17.00**. Контактные телефоны: (801774) 28473, (8029) 177 95 11.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 47-20-56.

Продавец: Открытое акционерное общество «Орша-Сервис», 211391, Витебская обл., г. Орша, ул. Герцена, д. 4-А, (0216) 51-25-15

Лот №1. Капитальное строение с инв.№240/С-19761 площадью 115,2 кв. м, наименование – здание конторы базы, назначение – здание административно-хозяйственное, по адресу: Витебская обл., Оршанский район, г. Орша, ул. Владимира Ленина, 230П. Капитальное строение с инв.№240/С-29416 площадью 52 кв. м, наименование – здание бытовки, назначение – здание неустановленного назначения по адресу: Витебская обл., Оршанский район, г. Орша, ул. Владимира Ленина, 230П/1. Имущество расположено на зем. участке №242400000001004361 площадью 0,0814. **Начальная цена:** 11 550 руб. без НДС. **Задаток:** 1 155 руб.

Повторный аукцион состоится 10.07.2018 в 11.00 по адресу: г. Орша, ул. Герцена, д. 4-А, в ОАО «Орша-Сервис». Срок внесения задатков и приема документов: с 25.06.2018 с 8.30 по 09.07.2018 до 17.30

Лот №1. Капитальное строение с инв. №240/С-17088 площадью 902,8 кв. м, наименование – мелкооптовая база, назначение – здание специализированное организаций оптовой торговли, материально-технического снабжения и сбыта продукции. Составные части и принадлежности: одноэтажное каменное здание мелкооптовой базы по адресу: Витебская обл., Оршанский район, г. Орша, ул. 1 Мая, 109. Капитальное строение с инв.№240/С-28848 площадью 2,5 кв. м, наименование – здание туалета, назначение – здание специализированное иного назначения по адресу: Витебская обл., Оршанский район, г. Орша, ул. 1 Мая, 109. Составные части и принадлежности: одноэтажное здание туалета с асфальтной площадкой, железобетонным ограждением, металлическими воротами. Имущество расположено на зем. участке №242400000001000512 площадью 0,4682. **Начальная цена:** 57 600 руб. без НДС. **Задаток:** 5 760 руб.

Повторный аукцион состоится 24.08.2018 в 11.00 по адресу: г. Орша, ул. Герцена, д. 4-А, в ОАО «Орша-Сервис». Срок внесения задатков и приема документов: с 25.06.2018 с 8.30 по 23.08.2018 до 17.30

Задаток перечисляется на р/с BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, BIC MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа — ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок заключения договора купли-продажи: 10 рабочих дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке имущества, оплата НДС сверх цены продажи объекта. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона, в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. В случае если аукцион признан несостоявшимся, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Ознакомление с объектами осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по месту нахождения имущества. Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 21.10.2017, 28.11.2017, 04.01.2018, 24.02.2018, 06.04.2018. С полной информацией о порядке проведения торгов, оформления участия и определения победителя аукциона можно ознакомиться на сайте www.marketvit.by. Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63

РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Управляющая компания холдинга «Агрокомбинат «Мачулищи»

№ Лота	Описание	Начальная цена, с НДС, бел. руб.	Задаток, бел. руб.
Лот №1	Посудомоечна машина AQUA 50 промышленная, инв. № КТ50000326	1 320,00	260,00
Лот №2	Пресс гидравлический П-63286, инв. № КТ00020257	5 400,00	810,00
Лот №3	Пресс листогибочный гидравлический, инв. № КТ50000224	8 880,00	1 100,00
Лот №4	Пресс листогибочный гидравлический ИП 1424, инв. № КТ50000254	8 880,00	1 100,00
Лот №5	Пресс листогибочный И 1020, инв. № КТ00021090	2 640,00	390,00
Лот №6	Пресс листогибочный И1020А, инв. № КТ50000258	3 840,00	570,00
Лот №7	Пресс листогибочный И1020А, инв. № КТ50000259	3 840,00	570,00
Лот №8	Пресс листогибочный И1330, инв. № КТ00020930	6 000,00	900,00
Лот №9	Пресс листогибочный с матрицей И1020А, инв. № КТ50000235.	3 840,00	570,00
Лот №10	Пресс ножницы НВ 5222Б, инв. № КТ00021067	4 320,00	640,00
Лот №11	Прилавок раздаточный SXEC 926x422x660, инв. № КТ50000330; Прилавок раздаточный SXED 1071x422x660, инв. № КТ50000328; Стол-тумба профессиональный с дверями купе 950x600x850, инв. № КТ50000331; Стол-тумба профессиональный с дверями купе 950x600x850, инв. № КТ50000332; Транспортная дорожка для подносов SXDR 4770x307x30, инв. № КТ50000333; Шпилька КШ-3 (для столовых подносов), инв. № КТ50000334; Шпилька КШ-3 (для столовых подносов), инв. № КТ50000335	2 928,00	430,00
Лот №12	Пылеулавливающий агрегат УВП-2000А, инв. № КТ50000180; Станок вертик-фрезер 65А80МФ4, инв. № КТ00021260	32 688,00	3 200,00
Лот №13	Полуавтомат для дуговой сварки ПДГ-251 УЗ.1, инв. № КТ50000221; Установка зачистная Rotofera F DIN10 110020, инв. № КТ50000359	1 272,00	250,00
Лот №14	Распред. устройство, инв. № КТ920853	1 320,00	260,00
Лот №15	Станок FINN-POWER, инв. № КТ50000339; Цифровой осциллограф RIGOL DS1052E, инв. № КТ01520102	279 936,00	27 900,00
Лот №16	Станок вертик.-сверлил. 2С132, инв. № КТ00020941	1 680,00	330,00
Лот №17	Станок вертик.-сверлил. 2н135, инв. № КТ00020885	1 320,00	260,00
Лот №18	Станок вертик.-сверлил. 2С132, инв. № КТ00020401	1 680,00	330,00
Лот №19	Станок внутришлифовальный 3к-2281А, инв. № КТ00020133	10 080,00	1 300,00
Лот №20	Станок консольно-фрезерный 6т12-1, инв. № КТ00020541	3 240,00	480,00
Лот №21	Станок консольно-фрезерный 6т82-Г, инв. № КТ00020176	2 880,00	430,00
Лот №22	Станок консольно-фрезерный 6т-12, инв. № КТ00020559	3 240,00	480,00
Лот №23	Станок копировально-фрезерный 6Г463, инв. № КТ00020605	1 680,00	330,00
Лот №24	Станок корд-расточной 2Е-450АФ1, инв. № КТ00020265	10 200,00	1 300,00
Лот №25	Станок лазерной резки LaserCUT-4015-3-1.5-S-RT (в компл), инв. № КТ50000343	229 200,00	22 900,00
Лот №26	Станок ленточнопильный мод. ARG 240 Plus, инв. № КТ49305	2 760,00	410,00
Лот №27	Станок плоскошлифов. ош-424Ф1-1, инв. № КТ00020702	4 800,00	720,00
Лот №28	Станок прод. фрез. 6М612МФ4, инв. № КТ00020826	199 200,00	19 900,00
Лот №29	Станок профильно-шлиф. ОШ224Н2, инв. № КТ00020310	3 720,00	550,00
Лот №30	Станок радиально-сверлильн. 2А554, инв. № КТ00020923; Вентилятор Л дв. 5,5-1,5-1500, инв. № КТ50000178	4 368,00	650,00
Лот №31	Станок расточной модели 2206ВМФ без ЧПУ и электроприводов (мехбаза к станку инв. № 20966)), инв. № КТ1520344; Станок свер-фр-раст с ЧПУ 2206ВМФ4 без мехбазы (м/б №1520344), инв. № КТ00020966	15 120,00	1 500,00
Лот №32	Станок токарно-винторезный мод. 1М63Н3, инв. № КТ5114	13 080,00	1 300,00

УСЛОВИЯ АУКЦИОНА

1. Победитель аукциона либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), Претендент на покупку, должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 5 (пяти) рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.
2. Победитель аукциона либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), Претендент на покупку, должен произвести оплату Объекта в течение 5 (пяти) рабочих дней после подписания договора купли-продажи.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством и настоящим договором для Победителя аукциона.

Аукцион состоится 25.07.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона — 5%.

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в открытом аукционе по продаже имущества (Лот №___), принадлежащего ОАО «Управляющая компания холдинга «Агрокомбинат «Мачулищи», проводимом 25 июля 2018 г.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 23.07.2018 в 11.00. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами. Контактное лицо для осмотра Объектов – Гуринович Владимир Геннадьевич, тел. +375 (29) 566 87 33

Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57,8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by